


# Арганізацыя працы па засваенні правапісу слоўнікавых слоў

## Выкарыстанне на ўроках рабочага сшытка “Слоўнікавыя словы” для II—IV класаў

Сістэматычная праца на ўроку са слоўнікавымі словамі дазваляе пашырыць і ўдакладніць лексічны запас вучняў малодшага школьнага ўзросту, павысіць узровень іх пісьменнасці.

Пры адборы слоўнікавых слоў для абавязковага засваення ў пачатковых класах улічваюцца наступныя **крытэрыі**:

- частотнасць выкарыстання ў сучаснай літаратурнай мове (словы павінны быць агульнаўжывальнымі);
- семантычная даступнасць слоў;
- лексічны матэрыял, што сустракаецца ў практыкаваннях і тэкстах падручнікаў па беларускай мове і літаратурным чытанні для кожнага класа.

Падчас фарміравання ў дзяцей арфаграфічнага навыку на першай ступені навучання праца са слоўнікавымі словамі патрабуе асаблівай увагі. Як сведчыць адукацыйная практыка, пры іх вывучэнні часта асноўны акцэнт робіцца на механічнае запамінанне, што не забяспечвае доўгатэрміновага і якаснага засваення правапісу такіх слоў.

Для арганізацыі грунтоўнай і мэтанакіраванай працы па засваенні правапісу слоўнікавых слоў карыснымі будуць рабочыя сшыткі для вучняў II—IV класаў “Слоўнікавыя словы” аўтараў В. У. Свірыдзенкі і Н. М. Антановіч (Мінск : Пачатковая школа, 2015). У іх знайшлі адлюстраванне разнастайныя **прыёмы працы**.

***Паскладовае арфаграфічнае прагаворванне*** прымяняецца на этапе знаёмства са слоўнікавым словам. Сутнасць прыёму заключаецца ў наступным:

1) слова запісваецца па складах (напрыклад: *я-блык)*;
2) настаўнік вымаўляе слова, выразна аддзяляючы склады адзін ад аднаго;
3) вучні паўтараюць слова некалькі разоў, абапіраючыся на паскладовы запіс.

Пры арфаграфічным прагаворванні дзейнічаюць два віды памяці — слыхавая і маўленчарухальная. Слыхавая памяць дапамагае запамінаць на слых фанемы ў словах. Праз маўленчарухальную памяць фанемны склад слоўнікавага слова замацоўваецца ў мускульных рухах органаў маўлення. Спецыяльна праведзеныя даследаванні (Л. К. Назарава) сведчаць, што прагаворванне ўголас, дакладны складовы аналіз слоў з цяжкімі арфаграмамі актывізуюць як запамінанне, так і прыпамінанне напісання слоў.

Як правіла, у рабочых сшытках “Слоўнікавыя словы” дадзены метадычны прыём спалучаецца з выкананнем займальных заданняў (“Разблытай “павуціну” і запішы слоўнікавае слова”, “Разгадай рэбус і запішы слоўнікавае слова” і інш.), якія, безумоўна, зацікавяць дзяцей, выклікаюць станоўчы эмацыянальны настрой, што падрыхтуе іх да больш свядомага ўспрымання складанай інфармацыі і засваення правапісу таго ці іншага слова.

Метадычна апраўданым з’яўляецца і ***шматразовы запіс слова***, у працэсе якога актыўна дзейнічае рухальная памяць. Значную ролю пры гэтым адыгрывае паўтарэнне рукарухальных дзеянняў праз пэўныя інтэрвалы часу, паколькі пры

адна-двухразовым напісанні слова неабходны арфаграфічны навык не выпрацоўваецца. Добра было б слоўнікавае слова шматразова запісаць пры першым яго прад'яўленні, аднак гэта не значыць, што трэба прымушаць дзяцей механічна дубліраваць яго запіс.

Для актывізацыі рухальных адчуванняў у рабочых сшытках "Слоўнікавыя словы" да кожнага слова прапануюцца розныя па змесце пісьмовыя практыкаванні, якія садзейнічаюць не толькі засваенню іх правапісу, але і пашырэнню, удакладненню актыўнага лексічнага запасу вучняў, развіццю іх маўлення, творчых здольнасцей.

Прывядзём некалькі прыкладаў такіх практыкаванняў са слоўнікавым словам *талерка* (II клас).

1) Якія літары "збеглі" са слова? Злучы іх з месцам пропуску ў слове.

р л м

та..е..ка

2) Запішы слоўнікавае слова, падзяліўшы яго для пераносу рознымі спосабамі.

3) Знайдзі імя дзяўчынкі, якое "схавалася" ў слоўнікавым слове. Запішы гэта імя.

4) Дапоўні сказ словамі з папярэдняга практыкавання.

__________ трымала ў руках __________*у*.

5) Дапоўні подпісы пад малюнкамі патрэбнымі словамі.





прыгожая ________ лятаючая ________

6) Прачытай верш. Дапоўні яго слоўнікавым словам.

**Дружбакі**

У коткі і сабачкі
была такая звычка:
з адной ________*і* елі,
як брацік і сястрычка.

*П. Прануза.*

? Каго называюць дружбакамі? Чаму коціка і сабачку назвалі дружбакамі?

***Знаходжанне, падбор і запіс аднакаранёвых слоў*** маюць на мэце засваенне правапісу не толькі слоўнікавых, але і вытворных ад іх слоў. У рабочыя сшыткі "Слоўнікавыя словы" ўключаны шэраг падобных практыкаванняў. Для прыкладу звернемся да слова *паштальён* (IV клас).

1) Прачытай верш. Дапоўні яго слоўнікавым словам.

**Падмянілі** ______________

Захварэў наш ______________,
і не носіць пошты ён.
Стаў у мамы я прасіць:
"Можна пошту мне насіць?"
"Што ж, нясі", — сказала мама.
Вучні класа ўсе таксама
пошту па чарзе насілі,
____________ падмянілі.
Акрыяў ____________,
быў нам вельмі ўдзячны ён.

*А. Дзеружынскі.*

! Знайдзі ў вершы аднакаранёвыя словы. Абазнач у іх корань.

2) Пастаў націск у словах. Дапішы патрэбныя літары на месцы пропускаў.

П..шта, п..штальён, п..штоўка, па..тамт.

! Закрэслі лішняе слова. Выдзелі корань у аднакаранёвых словах.

Свядомаму засваенню слоўнікавых слоў, правапіс якіх рэгулюецца арфаграфічнымі правіламі, будзе садзейнічаць ***адпрацоўка алгарытму выкарыстання пэўнага правіла***, падчас прымянення якога мабілізуюцца слых, зрокавая памяць, кінестэзічныя адчуванні, адбываецца актывізацыя разумовай дзейнасці вучняў.

Напрыклад, перад запісам слоўнікавага слова *гара**дж**ане* (IV клас) узгадваецца правіла правапісу слоў з літарамі **о**, **э** — **а** і адпаведны алгарытм:

1. Вымаві слова.
2. Вызнач націск.
3. Пад націскам пішы **о**, **э**. / Не пад націскам на месцы **о**, **э** пішы **а**.

Наступнае практыкаванне будзе садзейнічаць засваенню гэтага алгарытму.

! Пастаў націск у словах. Устаў прапушчаныя літары.

Г..рад — г..радскі, г..р..джане, прыг..рад.

Рабочыя сшыткі “Слоўнікавыя словы” прызначаны для выкарыстання на ўроках беларускай мовы і ў пазаўрочны час. Так, урок у II класе па тэме **“Няпарныя цвёрдыя зычныя гукі. Правапіс слоў з імі”** ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання ўключае знаёмства са слоўнікавым словам *ручнік*. На этапе *замацавання* можна арганізаваць наступную працу па засваенні правапісу слоўнікавага слова:

На дошцы змешчаны словы з тэксту практ. 57.

Ручнікі, на Беларусі, упрыгожвалі, вышыўкай, карункамі, кросны.

Разгледзьце малюнак да тэксту. Правільна вымавіце словы, запісаныя на дошцы. Што абазначае слова *карункі*? *Кросны*? Назавіце ў запісаных словах няпарныя цвёрдыя зычныя гукі. Пра што пойдзе размова ў тэксце? Паслухайце тэкст і адкажыце, з чаго раней выраблялі ручнікі. Як іх упрыгожвалі? Якога колеру беларускія ручнікі?

***Праца са слоўнікавым словам***

**Настаўнік.** У тэксце сустрэлася новае слоўнікавае слова — *ручнік*.

Колькі ў ім складоў? Вызначце націскны склад. Вымавіце па парадку гукі ў гэтым слове, назавіце літары. Запішыце слова, пастаўце ў ім націск. Як можна назваць маленькі ручнік?

***Праца па сшытку*** (практ. 6, 2)

1) Дапоўніце сказ з практ. 6 слоўнікавым словам.

Маленькі __________ — гэта ручнічок.

Падкрэсліце ў словах літары, якія абазначаюць няпарныя цвёрдыя зычныя гукі.

Пасля самастойнага выканання задання адзін з вучняў зачытвае сказ, называе адпаведныя літары.

2) Прачытайце верш з практ. 2. Вусна дапоўніце яго слоўнікавым словам. Чым упрыгожаны бабулін ручнік? Якое слова ў вершы падказала вам, што ўнучцы ён вельмі падабаецца?

На бабчын _________ заглядзелася ўнучка,  
і гладзіць _________ яна кволаю ручкай.  
Пеўніка ўнучка адразу пазнала,  
калісьці бабуля яго вышывала.

*Ю. Свірка.*

***кволы** — слабы

Дапішыце слоўнікавае слова ў верш, прагаворваючы яго самі сабе ў час запісу. Падзяліце слоўнікавае слова рыскай (|) для пераносу.

Пасля самастойнага выканання задання два вучні паказваюць на дошцы розныя варыянты пераносу слоўнікавага слова: *ру-чнік*, *руч-нік*.

Пры *падвядзенні вынікаў* урока мэтазгодна спачатку арганізаваць гутарку па пытаннях: якія цвёрдыя зычныя гукі не маюць парных мяккіх? якія галосныя літары трэба пісаць у спалучэннях **жы-шы**, **жэ-шэ**, **цэ**? Потым прапанаваць разгадаць рэбус (практ. 1 сшытка):




Адным з варыянтаў дыферэнцыраванага *дамашняга задання* можа стаць выкананне практ. 4 сшытка, накіраванага адначасова на адпрацоўку вымаўлення слоў з няпарнымі цвёрдымі зычнымі гукамі і навыку правапісу слова *ручнік*.

Пастаянны зварот да слоўнікавага слова на розных этапах урока і ў пазаўрочны час будзе садзейнічаць паспяховаму засваенню яго правапісу. Варта адзначыць, што праца з такімі словамі не павінна абмяжоўвацца адным урокам. На працягу 3—4 тыдняў слоўнікавае слова неабходна выкарыстоўваць да 5—7 разоў у разнастайных практыкаваннях. Акрамя таго, вучні, якія адчуваюць цяжкасці ў засваенні правапісу слоўнікавых слоў, маюць магчымасць выконваць практыкаванні дапаможніка пад кіраўніцтвам настаўніка (на падтрымліваючых занятках) або бацькоў (у працэсе выканання дамашніх заданняў).

Рабочыя сшыткі “Слоўнікавыя словы” для вучняў II—IV класаў дапамогуць настаўніку арганізаваць і праверку сфарміраванасці навыку правапісу слоўнікавых слоў. Падмацуем сказанае прыкладам са сшытка для III класа.

1) Запоўні крыжаванкі. Дапішы патрэбныя літары ў слоўнікавыя словы.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | п | | з | | | | |
| Б | | л | | р | у | с | ь |
| | н | | ў | | | | |
| | а | | ж | | | | |
| | л | | д | | | | |
| | | | ы | | | | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | б | | |
| п | а | | у | к | | | л | | |
| | | о | | | | | і | | |
| | | б | | | п | о | | т | а |
| | | л | | | | | ч | | |
| ф | л | | м | а | с | т | | р | |
| | | к | | | | | ц | | |
| | | а | | | | | ь | | |

2) Запішы адным слоўнікавым словам.

- Уласцівасць і стан чыстага — гэта *ч*__________.
- Утвараць тонкі меладычны гук — гэта значыць *з*_____________.
- Жывёліна, якая пляце павуціну, — гэта *п*_______.
- Падоўжаная скрыначка для ручак, алоўкаў, гумак — гэта *п*_________.
- Галаўны ўбор з палямі — гэта *к*____________.
- Свяціцца або адсвечваць роўным святлом — гэта значыць *б*_____________.
- Вялікая маса згусцелай вадзяной пары ў атмасферы — гэта *в*_____________.
- У любы час, пастаянна — гэта значыць *з*________.

3) Падпішы малюнкі патрэбнымі слоўнікавымі словамі.


_______________ 
_______________


_______________ 
_______________


_______________ 
_______________


_______________ 
_______________


_______________ 
_______________

4) Разгадай галаваломку — збяры кветкі ў вянок. Упішы назвы малюнкаў у пялёсткі па гадзіннікавай стрэлцы. Пачынай упісваць слова з пазначанага пялёстка.



Такім чынам, прадстаўленыя выданні могуць быць выкарыстаны для знаёмства са слоўнікавымі словамі, замацавання іх правапісу, праверкі сфарміраванасці арфаграфічных навыкаў. Практыкаванні з рабочых сшыткаў "Слоўнікавыя словы" можна арганічна ўключаць у працу па тэме ўрока, прапаноўваць для выканання на падтрымліваючых занятках, а таксама выкарыстоўваць у якасці дыферэнцыраваных дамашніх заданняў.

**В. І. СВІРЫДЗЕНКА,**
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства
факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка;

**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства
факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка.